5. Симакова, С. И. Тенденции визуализации журналистского контента в современных СМИ / С. И. Симакова // Вестник Северо-Осетинского государственного университета имени Коста Левановича Хетагурова. – 2015. – № 3. – С. 213–218.
6. Степанов, В. Стратегии и форматы работы белорусских СМИ с пользовательским контентом из социальных медиа / В. Степанов // Вестник БГУ, Сер. 4. Филология. Журналистика. Педагогика. – 2016. – № 2. – С. 88–92.
7. Connected Consumer Survey 2016 [Electronic resource]. – Mode of access: https://goo.gl/9QaYnK. – Date of access: 15.11.2016.

**Пётр Дарашчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*(Беларусь)*

# ГАЗЕТА «ПОЛЕССКАЯ ПРАВДА» (Гомель) У ГАДЫ НЭПА (1920–1926 гг.): АД КАЛЕКТЫЎНАЙ ПАДПІСКІ ДА ІНДЫВІДУАЛЬНАГА ПАДПІСЧЫКА

Восенню 2016 г. споўнілася 90 гадоў з часу ўключэння Гомельскага і Рэчыцкага паветаў у склад БССР. Узбуйненне Беларусі за кошт паўднёва-ўсходніх зямель, дзе пераважала беларускае насельніцтва, праходзіла ў два этапы (1924 і 1926 гг.), а да гэтага Гомельшчына, як Магілёўшчына і Віцебшчына, уваходзілі ў склад РСФСР (з 1920 г.). У пачатку аднаўленчага перыяду на яе тэрыторыі выходзілі некалькі перыядычных выданняў – «Полесская правда», «Новая деревня», «Набат молодежи», «Наш понедельник» і часопіс «Известия Гомельского губкома РКП(б)».

Вядучым выданнем сярод мясцовых газет рэгіёна была газета «Полесская правда» (зараз «Гомельская праўда»). Гісторыя газеты пачалася яшчэ ў 1917 г., калі ў горадзе пачала выдавацца газета «Известия Революционного комитета г. Гомеля и уезда». Пасля заканчэння Грамадзянскай вайны яна аднавіла сваю дзейнасць з 1 мая 1920 г. і выходзіла пад загалоўкам «Полесская правда» да 1938 г., калі яе перайменавалі ў «Гомельскую праўду». На пасяджэнні Гомельскага губкама РКП(б) 19 ліпеня 1920 г. рэдактарам газеты быў прызначаны Рыгор Навумавіч Брагінскі. Біяграфічных звестак аб месцы нараджэння і атрыманай адукацыі не захавалася. Нарадзіўся ён у 1891 г. Удзельнічаў у сацыял-дэмакратычным руху з 1905 г., у верасні 1918 г. уступіў у рады бальшавіцкай партыі. Акрамя «Полесскай правды» працаваў рэдакта-

рам «Звязды», газет у Тамбове, Бранску, Арцёмаўску, Харкаве, Ашхабадзе (сучасны Ашгабат).

У гады Грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі, калі асноўнымі ў рабоце друку былі «метады баявога загаду», газеты, у тым ліку і мясцовыя, друкавалі на сваіх старонках шмат афіцыёзу, мелі слабыя сувязі з працоўнымі. Пачатак 1920-х гг. – гэта час актыўнай працы мясцовых улад па фарміраванні матэрыяльнай базы для выпуску газет і іншай друкаванай прадукцыі. Створаны ў маі 1919 г. паліграфаддзел Гомельскага Савета народнай гаспадаркі заклаў эканамічныя асновы выдавецкай справы ў рэгіёне. Наступным крокам стала арганізацыя працы аддзялення Дзяржаўнага выдавецтва (май 1920 г.). Дзякуючы пастаўкам паперы і фінансавай падтрымцы з Масквы матэрыяльная база друку Гомельшчыны істотна ўмацавалася.

Па ініцыятыве агітацыйна-прапагандысцкага аддзела губкама партыі ў чэрвені 1920 г. адбылася рэарганізацыя сеткі газет, у выніку чаго былі зачынены павятовыя выданні «Заря Коммуны» (Рагачоў), «Известия» (Почап), «Коммунист» (Старадуб), «Набат» (Чэрыкаў). У губерні засталіся толькі тры газеты – «Полесская правда» (Гомель), «Соха и Молот» (Магілёў) і «Известия» (Клінцы), на дзейнасць якіх звярталася асаблівая ўвага. Былі значна павялічаны іх тыражы з такім разлікам, каб кожнае выданне абслугоўвала пэўную тэрыторыю. «Полесская правда» выходзіць тыражом у 8000 экз., магілёўская і клінцоўская газеты павялічылі свае наклады да 6000 экз. кожная.

Адначасова з гэтым былі аб’яднаны разрозненыя да таго часу органы друку ў губернскім цэнтры і паветах. Зліццё выдавецкіх структур РОСТА, «Полесская правда» і іншых у рамках адзінага кіраўніцтва дазволіла пазбавіцца ведамаснай разрозненасці, дабіцца значнай эканоміі фінансаў. Агітпрап губкама летам і восенню 1920 г. павёў актыўную дзейнасць па распаўсюджванні не толькі цэнтральнага перыядычнага друку, але і губернскіх газет. Праз мясцовае аддзяленне Дзяржаўнага выдавецтва за ліпень, жнівень і верасень 1920 г. было распаўсюджана 180000 экз. газет, з іх мясцовых – 75000 экз. Гомель і Гомельскі павет атрымалі каля 50000 экз. выданняў, астатнія 130000 экз. былі распаўсюджаны па 13 паветах губерні. Гарадское насельніцтва атрымала 30 % ад агульнай колькасці газет, вясковыя жыхары – 40 %, вайскоўцы Чырвонай арміі – 20 %, камуністы – 10 % [2, с. 15].

У жніўні 1920 г. пачынаецца выданне часопіса «Известия Гомельского губкома РКП(б)», першы яго нумар быў надрукаваны тыражом 2000 экз. Як адзначаў у сваіх успамінах аб пачатку яго працы І. Клей-

нер, «литературных работников среди партийцев тогда не было; пришлось прибегать в помощи беспартийного товарища. Первые номера проходили “цензуру” т. Пестуна. Но вскоре редактирование переходит к т. Брагинскому» [3, с. 23]. Рэдактару «Полесской правды» прыйшлося несці двайную нагрузку – выпускаць губернскую газету і партыйны часопіс, прычым арыгіналы матэрыялаў для апошняга падаваліся дрэнна апрацаванымі. Часопіс «Известия Гомельского губкома РКП(б)» не меў дастатковай колькасці шрыфтоў, з-за гэтага замаруджваўся працэс набору, да таго ж яго старонкі запаўняліся артыкуламі вузкага кола аўтараў – Пестуна, Нёманава, Альховага, Лялевіча.

Напрыканцы 1920 г. у Гомелі была створана газета для вяскоўцаў «Новая деревня», што канчаткова вызначыла кірунак дзейнасці «Полесской правды». Перад ёй была пастаўлена канкрэтная задача – стаць газетай для горада і рабочых, асвятляць на сваіх старонках сацыяльна-эканамічныя пытанні. Паварот да чытача і яго надзённых праблем распачаўся ў канцы 1921 г., калі Краіна Саветаў узяла курс на новую эканамічную палітыку. Пераход газет на самафінансаванне і гаспадарчы разлік аказаўся вельмі пакутлівым і складаным, бо праводзіўся ва ўмовах разрухі і адсутнасці фінансавых сродкаў. «Полесская правда» і іншыя газеты рассылаліся ў адпаведнасці з развёрсткай да сакавіка 1922 г. І толькі 15 лютага таго ж года была ўпершыню аб’яўлена платная падпіска на перыядычныя выданні, якія выходзілі ў Гомельскай губерні.

Вясной 1922 г. пытанні паляпшэння якасці друкаваных выданняў і іх папулярызацыі ў горадзе і вёсцы сталі, можна сказаць, найважнейшымі ў рабоце партыйных органаў і рэдакцый газет. Не маючы дастатковага вопыту правядзення кампаній па папулярызацыі друку і правядзенні платнай падпіскі, мясцовыя партыйныя ўлады і самі газетчыкі спрабавалі распрацаваць найбольш дзейсныя формы прапагандысцкай работы. Праведзены ў Гомелі трохтыднёвік друку, прысвечаны святкаванню 10-й гадавіны з дня выхаду газеты «Правда» (№ 1 выйшаў 5 мая 1912 г.), знаходзіўся ў цэнтры ўвагі партыйных структур і насельніцтва губерні. Выданні ўсебакова асвятлялі гісторыю, ролю і задачы пралетарскай прэсы. Газета «Полесская правда» вяла на сваіх старонках кампанію, выкарыстоўваючы кідкія лозунгі аб падпісцы на выданні і пашырэнні няштатнага актыву органаў друку.

Адначасова з правядзеннем масавых мерапрыемстваў мясцовыя журналісты спрабавалі асэнсаваць на старонках друку перспектывы дзейнасці работы рэдакцый па наладжванні сувязей з шырокім аўтарскім

актывам і набліжэнні тэматыкі публікацый да надзённых пытанняў жыцця. Журналіст Г. Лялевіч у артыкуле «О рабочей печати», апублікаваным у часопісе «Известия Гомельского губкома РКП(б)», адзначаў: «В настоящий момент, когда нашей партии приходится сражаться с мелкобуржуазной идеологией не только чекистским, но и дискусионным способом, роль нашей прессы, как орудия коммунистического воспитания масс, неимоверно велика [4, с. 5].

Аўтар гэтай публікацыі меркаваў, што для пашырэння ўплыву газеты на шырокую аўдыторыю трэба прывучыць рабочых яе чытаць і прыслухоўвацца да яе голасу. Зрабіць газету запатрабаванай рабочымі можна толькі тады, калі кожны артыкул, кожная заметка будуць цікавымі для чытачоў. Г. Лялевіч лічыў амаль злачынствам змяшчэнне ў газетах сухога і зразумелага толькі канцылярскім работнікам матэрыялу і выступаў за бязлітаснае выкараненне са старонак выданняў пратакольных і цыркулярных тэкстаў. А калі ўсё ж афіцыйныя матэрыялы неабходна будзе апублікаваць, то яны павінны адпаведным чынам апрацоўвацца работнікамі рэдакцыі, падавацца ў жывой форме.

У выніку праведзенай у Гомелі, гарадах і вёсках губерні кампаніі па папулярызацыі друку тыраж газеты «Полесская правда» значна павялічыўся, было прынята рашэнне друкаваць яе на шасці старонках тры разы на тыдзень. Многія заводы і фабрыкі ўсім калектывам падпісваліся на газету, асобныя працоўныя калектывы далі па 30–40 і больш падпісчыкаў. Як адзначаў Я. Міраў у сваім артыкуле «Трехнедельник печати а Гомеле», «за три недели, в течение которых длилась кампания, «Полесская правда» навербовала в Гомеле до 1000 подписчиков. <…> Другим показателем успеха кампании явилось усиление притока рабочих писем в редакцию. Есть ряд писем-запросов о том, как писать в газетах. С некоторых предприятий поступают письма от выделенных уже ими корреспондентов» [5, с. 7].

У маі 1922 г. «Полесская правда» была ўключана ў склад выдавецкага кааператыва «Гомельский рабочий», які не толькі займаўся выпускам мясцовых газет, але і пачаў друкаваць уласныя кнігі і брашуры. Пытанне аб рабоце газеты пастаянна знаходзілася на кантролі губкама, які штомесячна выносіў іх на сваё абмеркаванне. У аб’яве, змешчанай у жнівеньскім нумары часопіса «Известия Гомельского губкома РКП(б)», вызначаўся кошт падпіскі на «Полесскую правду»: на месяц – 200 руб., на два месяцы – 400, на тры месяцы – 500 руб. Губернская нарада журналістаў (23–24 верасня 1922 г.), на якой быў заслуханы даклад сакратара Гомель-

скага губкама партыі М. Хатаевіча аб рабоце вядучага выдання, адзначала як дасягненні, так і недахопы ў пастаноўцы «Полесской правды». Яе знешні выгляд пакідаў жадаць лепшага па тэхнічных прычынах (малы фармат, дрэнны шрыфт). Журналісты звярнулі ўвагу і на «кляузный» характар лістоў у рэдакцыю, якія літаральна выцеснілі са старонак газеты станоўчыя матэрыялы і жывыя заметкі аб жыцці рабочых губерні.

Рэдактарамі «Полесской правды» пасля Р. Брагінскага да кастрычніка 1922 г. працаваў Г. Лялевіч, а пасля яго ад'езду гэту пасаду займаў Янкоўскі. Бюро губкама партыі, адзначаючы пэўныя станоўчыя зрухі ў рабоце рэдакцыі, зафіксавала і значныя недахопы – недастатковую якасць літаратурнай апрацоўкі матэрыялаў, дрэнны шрыфт, слабыя сувязі з няштатнымі карэспандэнтамі.

Партыйныя органы выкарыстоўвалі для прытоку падпісчыкаў і адміністрацыйны рэсурс. У цыркулярах губкама таго часу, якія рассылаліся мясцовым партыйным, прафсаюзным і грамадскім арганізацыям, патрабавалася дабіцца шырокага распаўсюджвання «Полесской правды» і іншых газет. Сярод 50000 рабочых і служачых, якія былі членамі розных прафсаюзных арганізацый Гомельшчыны, толькі 5000 з'яўляліся падпісчыкамі вядучай губернскай газеты. За кароткі тэрмін (снежань 1922 – студзень 1923 г.) ставілася задача сабраць 10000 падпісчыкаў «Полесской правды». Барацьба за распаўсюджванне друку метадам «кавалерийского наскока» падмацоўвалася і прымусовымі мерамі: «необходимо обязать администрации предприятий или учреждений уплачивать, согласно постановлению президиума губисполкома от 13 июня с. г., стоимость подписки, сделанной рабочими и служащими, удерживая затем эту сумму при выплате жалованья» [6, с. 39]. Газеты «Полесская правда» і «Новая деревня» друкавалі на сваіх старонках «чырвоныя» і «чорныя» дошкі, дзе асвятляўся ход падпіснай кампаніі.

На працягу студзеня – мая 1923 г. рэдакцыя «Полесской правды» стварыла сетку рабочых карэспандэнтаў па г. Гомелі, яе паліграфічная база папоўнілася новымі шрыфтамі. Павялічыць фармат газеты і палепшыць яе дызайн планавалася шляхам папаўнення кадраў рэдакцыі тэхнічнымі работнікамі з ліку курсантаў губпартшколы і іншых мясцовых навучальных устаноў. Газеце прапанавалася не толькі асвятляць жыццё Гомеля, але і звяртаць большую увагу на дзейнасць і праблемы паветаў. Каб не страціць ранейшых і прыцягнуць новых падпісчыкаў, губкам лічыў магчымым нават зменшыць падпісную цану для тых катэгорый працоўных, хто атрымліваў нізкую зарплату.

Фінансавая і гаспадарчая дзейнасць «Полесской правды» была самым цесным чынам звязана з друкарскай фабрыкай «Полеспечать». Гэта паліграфічнае прадпрыемства, створанае 1 снежня 1922 г., выдавала ўсе органы друку Гомеля, актыўна ўплываючы на іх рэдакцыйную палітыку. Даходы газет пастаянна «падразаліся» такімі зменлівымі фактарамі, як колькасць падпісчыкаў, паступленне платных аб'яў ад прадпрыемстваў, арганізацый і грамадзян. У верасені 1923 г. з-за пагаршэння фінансавага становішча была створана адзіная рэдакцыйная калегія «Полесской правды», «Новой деревни» і часопіса «Известия Гомельского губкома РКП(б)», спынены выхад газеты «Наш понедельник». Гэта дало магчымасць павялічыць фармат вядучай газеты губерні, пашырыць аддзел партыйнага жыцця, палепшыць знешні выгляд газеты і яе тэхнічную пастаноўку. Асноўнымі аддзеламі газеты ад гэтага часу павінны былі стаць рабочае жыццё, прафесійная, партыйная, агульная інфармацыя, вясковае жыццё і літаратурна-мастацкі аддзел [1, с. 77].

У 1924 г., калі большая частка Гомельскай губерні была ўключана ў склад БССР (за выключэннем Гомельскага і Рэчыцкага паветаў), газета «Полесская правда» вяла актыўную работу з рабселькарамі, аказвала дапамогу шматлікім рэдакцыям насценгазет. Колькасць рабкараў, якія пастанна супрацоўнічалі з выданнем, дасягала 220–300 чалавек. Але будучыня губернскага друку і «Полесской правды» бачылася трывожнай. Яго перспектывы спрабаваў акрэсліць напрыканцы 1925 г. І. Палякоў, аўтар часопіса «Полесский коммунар». Гомельскія газеты з-за дарагавізны паперы і раздутасці штатаў сталі фінансава стратнымі, у выніку з 1 кастрычніка 1925 г. яны былі вылучаны ў асобнае аб'яднанне «Гомгазета», пазбавіўшыся матэрыяльнай падтрымкі з боку «Полеспечати». Дасягнуць самаакупнасці «Полесской правды» можна было б толькі пры павелічэнні тыражу з 9700 да 15000 экз., але ў бліжэйшы час гэта было нерэальна. Выхад бачыўся ў скарачэнні колькасці выданняў у губерні.

Другое ўзбуйненне БССР (1926 г.) і аб'яднанне этнічных беларускіх зямель у адзіны палітычны і гаспадарча-прамысловы комплекс прывялі да ўключэння Гомельскага і Рэчыцкага паветаў у склад БССР. «Полесская правда» пасля гэтай рэарганізацыі атрымала статус акруговай газеты і ў новых умовах працягвала вырашаць свае фінансавыя, арганізацыйныя і творчыя праблемы.

Такім чынам, «Полесская правда», якая на працягу шасці гадоў з'яўлялася вядучым друкаваным органам Гомельшчыны, зрабіла вялікі ўнёсак у грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае жыц-

цё губерні. Выданне актыўна праводзіла ў жыццё ідэі бальшавіцкай партыі напрыканцы перыяду ваеннага камунізму і ў час аднаўлення народнай гаспадаркі, папулярызавала планы першых сацыялістычных пераўтварэнняў, умацоўвала аўтарытэт новай улады ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне Беларусі, істотна узбагаціла вопыт камерцыйнай і фінансавай дзейнасці газет у перыяд нэпа.

***Літаратура***


1. Бюро губкома. Постановления. Доклад «Полеспечати» (от 3 сентября 1923 г.) // Известия Гомельского губкома РКП(б). – 1923. – № 52–53. – С. 77.
2. Доклад губкома // Известия Гомельского губкома РКП(б). – 1920. – № 5. – С. 13–15.
3. Клейнер, И. «Известия» за четыре года / И. Клейнер // Известия Гомельского губкома РКП(б). – 1924. – № 80. – С. 23.
4. Лелевич, Г. О рабочей печати / Г. Лелевич // Известия Гомельского губкома РКП(б). – 1922. – № 23. – С. 5–6.
5. Миров, Я. Трехнедельник печати в Гомеле. Десятилетие «Правды» / Я. Миров // Известия Гомельского губкома РКП(б). – 1922. – № 23. – С. 6–7.
6. Циркуляры Гомельского комитета РКП(б). О кампании подписки на газеты // Известия Гомельского губкома РКП(б). – 1922. – № 35. – С. 38–39.



**Дмитрий Дроздов**
*Белорусский государственный университет*
*(Беларусь)*


## МЕНЕДЖМЕНТ КОНТЕНТА КАК ВАЖНЕЙШИЙ ТРЕНД УПРАВЛЕНИЯ СОВРЕМЕННЫМИ МЕДИА

Увеличение количества многообразных информационных ресурсов интернета вызывает к жизни специфические веб-феномены, которые, как и любые рыночные продукты и услуги, имеют своих потребителей, свои ниши и жизненные циклы. С другой стороны, по мере развития глобальной сети усложняются процессы функционирования ее отдельных сегментов и субъектов, что вызывает объективную необходимость теоретического осмысления данных процессов с целью выработки научно обоснованной практической стратегии эффективного управления ими в целом и их отдельными составляющими. В таких условиях и сформировался феномен менеджмента медиаконтента, который сегодня относят преимущественно к информационной деятельности в интерне-